Нядзеля
22
красавіка
1945 г.

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СНК БССР

№ 3 (527)
Цана 50 кап.

Мастацтва належыць народу

«Мастацтва належыць народу. Яно павінна ўваходзіць сваімі найглыбейшымі карэннямі ў самую гушчу шырокіх працоўных мас. Яно павінна быць зразумела гэтым масам і любімае імі. Яно павінна аб'ednаць пачуццё, думку і волю гэтых мас, падымаць іх».

Гэтае выказванне геніяльнага правадыра народаў Ул. І. Леніна стала сцягам совецкага мастацтва. Ідэя Ільіча аб глыбокай народнасці мастацтва знайшла сваё далейшае развіццё ў лозунгу соцыялістычнага рэалізма, сфармуліраваным вялікім паплечнікам і прадаўжальнікам справы Леніна—таварышам Сталіным.

Так, совецкае мастацтва служыць не эстэтам і гурманам, а ўсяму народу. Гэта выяўляецца ў тым, што інтарэсы народа сталі інтарэсамі нашых пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, актораў, што совецкае мастацтва сапраўды стала часткаю агульна-пролетарскае, агульна-народнае справы.

Такія якасці нашага мастацтва ярчэй за ўсё праявіліся ў дні Айчыннай вайны. З першага дня вераломнага нападу фашысцкіх захопнікаў на нашу радзіму совецкая мастацкая інтэлігенцыя стала ў рады змагароў супроць фашысцкае навалы. Верш і музычная сімфонія, нарыс і спектакль, аповесць і карціна,— усё было аддадзена справе перамогі над ворагам.

Неад'емнасць інтарэсаў совецкага мастацтва ад інтарэсаў народа выяўляецца і ў тым, як наш урад, партыя, грамадскасць ставяцца да дзеячоў мастацтва і навукі. Яны акружаны самай высокай пашанай у краіне, іх роля ў вялікай вызваленчай барацьбе совецкага народа вызнаецца, як роля байцоў першай шарэнгі.

Усё гэта мае простае вытлумачэнне і да беларускай літаратуры, у якой непарыўная сувязь з народам адчуваецца вельмі моцна на працягу ўсяго яе развіцця.

Геніяльны ключ для разумення той вялікай ролі, якую іграла беларуская літаратура ў нацыянальна-вызваленчай барацьбе ў перадрэволюцыйныя часы, дае наступнае выказванне Ул. І. Леніна:

«Для ўкраінцаў і беларусаў, напрыклад, толькі чалавек, які ў марах жыве на Марсе, мог-бы адмаўляць, што тут няма яшчэ завяршэння нацыянальнага руху, што абуджэнне мас да авалодання роднай мовай і яе літаратурай...— тут яшчэ адбываецца. «Бацькаўшчына» тут яшчэ не праспявала ўсёй сваёй гістарычнай песні. «Абарона бацькаўшчыны» яшчэ можа быць тут абаронай дэмакратыі, роднай мовы, палітычнай свабоды супроць нацый, што прыгнятаюць...»

Толькі ў святле гэтага ленінскага выказвання становіцца зразумелай велізарная роля ў гісторыі беларускай літаратуры такіх выдатных не прадстаўнікоў, як Янка Купала і Якуб Колас. Іх творы адзначалі выхад на гістарычную арэну новых сіл беларускага народа, а крык пратэсту ў абарону бацькаўшчыны, роднай мовы і палітычнай свабоды ў іх творах меў глыбока-прагрэсіўнае значэнне.

Вялікую спадчыну пакінуў нам правадыр працоўных Ул. І. Ленін. Гэта спадчына, развітая і дапоўненая слаўным прадаўжальнікам яго справы І. В. Сталіным, служыць путяводнай зоркай у жыцці, працы і барацьбе совецкага народа.

Навуковая спадчына Леніна дае ключ для развязання самых складаных праблем нашай навукі, літаратуры, мастацтва. Выказванне Ільіча аб Талстым, раскрыццё супярэчнасцей у творчасці гэтага мастака, падкрэсліванне таго, што «Талстой — геніяльны мастак— не мог не адлюстраваць у сваіх творах некаторых істотных бакоў рэвалюцыі», — дае аснову для ацэнкі класічнай спадчыны многіх выдатных дзеячоў культуры мінулага.

Тыя бераслівыя адносіны, якія ёсць у нашай краіне да ўсяго лепшага, што створана чалавецтвам у мінулыя вякі, з'яўляюцца ажыццяўленнем ленінскай формулы аб крытычным выкарыстанні культурнай спадчыны.

З вялікага вучэння Леніна і Сталіна аб нацыянальным пытанні вынікае класічнае азначэнне сутнасці нацыянальнай культуры, дадзенае ў творах таварыша Сталіна, як культуры нацыянальнай формаю і соцыялістычнай зместам.

Нарэшце, глыбока актуальнае значэнне для развіцця нашай літаратуры і мастацтва мела і наступнае выказванне Ул. І. Леніна:

«Бясспрэчна, — пісаў Ільіч, — літаратурная справа менш за ўсё паддаецца механічнаму раўнанню, нівеліраванню, панаванню большасці над меншасцю. Бясспрэчна, у гэтай справе безумоўна патрэбна забяспечанне большай прасторы асабістай ініцыятыве, індывідуальным схільнасцям, прасторы думцы і фантазіі, форме і зместу».

Гэтае ленінскае разуменне мастацтва сыграла выключную ролю ў гісторыі совецкай літаратуры, у змаганні са спробамі вульгарызатараў абмежаваць пісьменнікаў у выбары тэмы, жанра, стылю. Ленін вучыць нас разумець спецыфічнасць літаратурнай працы, дзе павінна поўна выяўляцца індывідуальнасць творцы, яго схільнасці і дзе павінны быць даны вялікія магчымасці для пошукаў новых форм, для палёта фантазіі.

Вядома, гэтае сцверджанне не толькі не здымае пытання аб ідэйнай накіраванасці твора, а, наадварот, мае на мэце глыбокую тэндэнцыйнасць, палітычную завостранасць, партыйнасць яго. Ленін пісаў: «Літаратура павінна стаць партыйнай».

Для ўсіх совецкіх пісьменнікаў вялікім гонарам з'яўляецца выражаць у сваіх творах ідэі самай перадавой партыі ў свеце — партыі Леніна—Сталіна, пад кіраўніцтвам якой совецкі народ вызваляе свет ад жаху фашызма.

Такая гіганцкая фігура, якой з'яўляецца Ленін, не магла не прыкаваць да сябе ўвагу выдатнейшых пісьменнікаў свету. Яго воблік імкнуліся намаляваць Максім Горкі і Рамэн Ралан, Маякоўскі і Анры Барбюс. Анры Барбюс побач з Леніным паказвае другога геніяльнага чалавека сучаснасці—таварыша Сталіна, — вернага друга і прадаўжальніка справы Леніна.

Вобраз Ільіча знаходзіць яркае адлюстраванне і ў вуснай творчасці народа, у тым ліку і ў беларускім фальклоры. У беларускіх казках і песнях: «Чалавек-сонца», «Асілкі», «Ленінская праўда», «Дарожанька» паўстаюць перад намі два волаты—Ленін і Сталін. Яны змагаюцца з няпраўдай і прыгнётам, дбаюць аб простых людзях, дапамагаюць ім у горы,, выводзяць людзей на светлую дарожаньку:

Прайшлі той дарожанькай
Два багатыры,
Пракляцце з дарожанькі
Рукою знялі.
Шыроку дарожаньку
Ленін пралажыў,
Пастройку дарожанькі
Сталін завяршыў.

У беларускім мастацтве ёсць, праўда, першыя, але даволі плённыя спробы адлюстравання вобразаў правадыроў рэвалюцыі Леніна і Сталіна. Тут трэба адзначыць вобраз Леніна, створаны артыстам Малчанавым у п'есе «Крамлёўскія куранты», вершы Купалы, Коласа, Куляшова, паэмы Глебкі «Мужнасць» і «У тыя дні», спробу вершаванага паказу народнага падання аб Леніне ў маладога паэта Бялевіча. Аднак, задача паказу ўсёй велічы геніяў чалавецтва—Леніна і Сталіна—і на сёння з'яўляецца актуальнейшай і складанейшай задачай нашай літаратуры і мастацтва.

Ленін марыў аб новай соцыялістычнай літаратуры, свабоднай ад ланцугоў капіталістычнага грамадства, ад карысці і кар'еры. Ен марыў аб літаратуры, якая будзе служыць мільёнам і дзесяткам мільёнаў працоўных, што складаюць цвет краіны, яе сілу, яе будучыню.

Такая літаратура расце і мужнее ў краіне Советаў.

„Толькі Ленін умеў пісаць пра самыя заблытаныя рэчы так проста і ясна, сцісла і смела—калі кожная фраза не гаворыць, а страляе".

І. СТАЛІН.

Да 75-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна

Працоўныя Беларусі шырока адзначаюць 75-годдзе з дня нараджэння Уладзімера Ільіча Леніна. На прадпрыемствах і ўстановах праходзяць лекцыі і гутаркі, прысвечаныя жыццю і рэвалюцыйнай дзейнасці вялікага правадыра. Цікавая лекцыя адбылася ў Мінскім Доме партыйнай асветы на тэму: «Ленін—карыфей навукі», якую прачытала член-карэспандэнт Акадэміі Навук СССР прафесар А. М. Панкратава. Такая-ж лекцыя адбылася 19 красавіка ў урадавай бібліятэцы імені Горкага.

У абласных і гарадскіх бібліятэках рэспублікі арганізаваны выстаўкі ленінскай літаратуры і матэрыялаў аб Леніне. Умела падабрана літаратура, ілюстраваная здымкамі, на выстаўцы ў Брэсцкай бібліятэцы імені Пушкіна. Вялікая выстаўка абсталявана ў Беларускай Дзяржаўнай бібліятэцы, якая носіць імя Ул. І. Леніна. Тут ёсць шмат твораў Уладзімера Ільіча, выданых у гады рэвалюцыйнага ўздыму.

На выстаўцы прадстаўлена ленінская літаратура, выратаваная ад гітлераўскага знішчэння. Адступаючы з Мінска, нямецкія бандыты звалілі ў качагарку сотні тысяч каштоўнейшых кніг, каб спаліць іх. Але гітлераўцам не ўдалося падпаліць іх, бо часці Чырвонай Арміі ў гэты час былі ўжо ў горадзе. На пяты дзень пасля вызвалення Мінска ў бібліятэку прышлі совецкія людзі і вынеслі з качагаркі ўсе кнігі. На 29 тамах твораў Леніна да гэтага часу засталіся сляды барбарскага абыходжання гітлераўцаў з гістарычнымі помнікамі літаратуры.

Шмат кніг Ул. І. Леніна ўдалося выратаваць дырэктару Слонімскага краязнаўчага музея Баранавіцкай вобласці, тав. Старабруўскаму. Зараз гэта літаратура таксама паказана на выстаўцы, прысвечанай жыццю і дзейнасці геніяльнага правадыра пролетарыята.

У сувязі з 75-годдзем з дня нараджэння Леніна на экраны рэспублікі выпускаюцца лепшыя фільмы, прысвечаныя Уладзімеру Ільічу. Сярод іх— «Ленін у Кастрычніку», «Чалавек з ружжом», «Ленін у 1918 годзе». (БелТА).

* * *

У чытальнай зале бібліятэкі імені Горкага адчынена багатая выстаўка, прысвечаная 75-ці годдзю з дня нараджэння Ул. І. Леніна.

Апрача твораў Леніна на рускай мове, выстаўлены таксама пераклады яго кніг на беларускай, польскай, яўрэйскай і іншых мовах.

Асобнае месца на выстаўцы займае літаратура аб Леніне, успаміны, артыкулы ў часопісах і багатая бібліяграфія. Вялікую зацікаўленасць выклікаюць выпіскі з дакументаў і дырэктываў Леніна аб Беларусі, зробленыя супрацоўнікамі бібліятэкі з «Ленінскіх зборнікаў».

Кнігі з асабістай бібліятэкі Ул. І. Леніна

Варшава, 14 красавіка (ТАСС). У бібліятэцы польскага горада Быдгашч (Бромберг) шмат гадоў захоўваліся кнігі з асабістай бібліятэкі Уладзімера Ільіча Леніна. Сярод іх — стэнаграфічныя справаздачы Дзяржаўнай Думы за 1906 і 1907 гады, «Тэорыя дадатковай вартасці» Карла Маркса, выдання 1906 г., восьмы том збору твораў М. Г. Чарнышэўскага, выдання 1906 г., журналы «Наша заря», «Современный мир», «Запросы жизни» і другія.

На палях кніг адзнакі, зробленыя Уладзімерам Ільічом. Гэтыя кнігі чатырнаццаць год захоўваў адзін польскі пісьменнік. У 1932 годзе ён перадаў іх бібліятэцы горада Быдгашч. У час нямецкай акупацыі працаўнікі бібліятэкі старанна хавалі ад немцаў гэтыя кнігі.

Калі Чырвоная Армія вызваліла Быдгашч ад нямецкіх захопнікаў, кіраўнікі горада рашылі зрабіць совецкаму ўраду падарунак — перадаць кнігі, якія належалі Ул. І. Леніну.

Гэтымі днямі адбылася ўрачыстая перадача кніг прадстаўнікам Чырвонай Арміі. Глава Ваяводскай Рады Народовай доктар Вехна заявіў, што ўрачыстая перадача кніг з асабістай бібліятэкі Ул. І. Леніна прадстаўнікам Чырвонай Арміі з'яўляецца выражэннем бязмежнай удзячнасці польскага народа Маршалу Сталіну, Чырвонай Арміі, рускаму народу — вялікаму суседу і другу, які вызваліў Польшчу ад нямецкіх акупантаў.

Разам з кнігамі прэзідэнт горада перадаў прадстаўнікам Чырвонай Арміі грамату з пастановай урачыстага пасяджэння Рады Народовай горада Быдгашч. У грамаце гаворыцца: «Маршалу Сталіну, Масква, Крэмль. Грамадзяне горада Быдгашч, удзячныя за вызваленне ад германскага ярма, дасягнутае ў выніку выдатных перамог совецкай арміі, перадаюць Вам, вялікі Маршал, з кнігасховішча гарадской бібліятэкі г. Быдгашч кнігі з адзнакамі вялікага заснавальніка новай Расіі—Уладзімера Ільіча Леніна».

Помнік Леніна для Мінска адбудаваны

Помнік Леніну на плошчы каля Дома Урада ў Мінску быў дашчэнту разбураны нямецкімі захопнікамі. Пасля вызвалення сталіцы БССР было вырашана зноў адбудаваць гэты помнік. Да працы над яго адбудовай прыступіў калектыў ленінградскага завода «Манумент-скульптура», якому дапамагае аўтар праекта помніка скульптар М. Г. Манізэр.

Адліўка ў бронзе ўжо закончана і ў першыя дні мая помнік будзе зноў устаноўлен на старым месцы.

Эскізы да карцін, якія будуць паказаны на выстаўцы „Перамога"

Мастацкі совет пры Саюзе совецкіх мастакоў БССР на апошнім пасяджэнні прагледзеў рад эскізаў да новых карцін, якія аўтары мяркуюць паказаць на Усесаюзнай мастацкай выстаўцы «Перамога» ў Маскве.

Зацверджаны эскізы мастакоў-партызан, якія распрацоўваюць палотны аб дзейнасці народных мсціўцаў у варожым тылу. Тэмы ў кожнага з іх рознастайныя — «Сустрэча партызан з Чырвонай Арміяй» У. Сухаверхава; «Сувязь партызан з насельніцтвам», «Партызанскі лагер» і «Прысяга» З. Ле; «Прарыў праз балоты» Г. Бжазоўскага.

У гэты-ж дзень былі разгледжаны эскізы: «Сустрэча танкістаў з вызваленай сям'ёй» Л. Галубка, «Злавілі здрадніка» В. Ціхановіча, «Зварот партызан з баявой аперацыі» У. Хрусталёва, «Адраджэнне калгаса» І. Гімбіцкага, «Нашы ў Прусіі» і «На папялішчы» А. Шыбнева. «Партызанскі штаб за работай» М. Філіповіча, «Нашы прышлі» В. Цвіркі, «Дэсант» П. Гаўрыленкі, «На папялішчы» (афорт) Л. Рана.

Прагледжана ўжо 23 эскізы новых твораў, над якімі працуюць беларускія мастакі.

У абмеркаванні эскізаў прымаюць удзел усе беларускія мастакі. На апошнім пасяджэнні выступалі — І. Ахрэмчык, Я. Зайцаў, П. Гаўрыленка, . Лейтман, У. Хрусталёў, В. Цвірка, А. Шыбнёў.

НОВЫЯ П'ЕСЫ

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва друкуе для гурткоў мастацкай самадзейнасці зборнік «П'есы», у які ўвайшло дзесяць аднаактавых п'ес. Большасць змешчаных у зборніку твораў адлюстроўваюць партызанскую барацьбу ў варожым тылу і аднаўленчую працу совецкага народа. У кніжку ўвайшлі творы: Ус. Іванова «Дзядзя Косця», К. Крапівы «Валодзін гальштук», М. Клімковіча «На скрыжаванні дарог», А. Якімовіча «Блакада», Ус. Краўчанкі «Мост», І. Плахціна «Марынка», А. Есакова «Сустрэчы» і «Чужая», Г. Аўруцкага і А. Есакова «Цяжкае становішча», Ул. Няфёда «Мая хата з краю», Амаль усе гэтыя п'есы напісаны па заказу рэспубліканскага Дома народнай творчасці БССР. Па яго-ж ініцыятыве выдаецца зборнік.

Новыя творы беларускіх кампазітараў

У Саюзе совецкіх кампазітараў БССР адбылося чарговае праслухоўванне новых твораў.

Прысутныя пазнаёміліся з новым квартэтам кампазітара М. Аладава, які напісан для смычковых інструментаў. Ен складаецца з двух частак, што для музычных твораў гэтай формы—рэдкая з'ява. Большасць музычных тэм квартэта прасякнуты мелодыямі беларускіх народных песень.

У абмеркаванні гэтага твору прынялі ўдзел кампазітары — А. Багатыроў, Я. Цікоцкі, Р. Пукст, З. Лукас, П. Падкавыраў, В. Яфімаў і другія. Яны далі высокую ацэнку новаму квартэту М. Аладава.

На наступным сходзе кампазітараў БССР было праслухана новае «Фартапіяннае трыё» А. Багатырова. Напісана яно для выканання на скрыпцы, віяланчэлі і фартапіяна і складаецца з чатырох частак.

Выкананы твор выклікаў адабрэнне кампазітараў, выканаўцаў і музыказнаўцаў.

Антон Бялевіч

ЧАЛАВЕК-СОНЦА

(Палескае паданне пра Леніна)

Ен мудры і добры душой,
Не стопча ён краскі нагой,
Не стопча харошых усходаў
І ласку і праўду з сабой
Нясе ён і сее народу.
То там яго бачаць, то тут,
У кожны заходзіць ён кут,
Разумныя кажа парады,
І людзі сустрэцца з ім рады.
І ўсюды, дзе ступіць нагой, —
Жыта, пшаніца трубой...
Разумнае кажа ён слова.
Марозиаю, снежнай зімой
Праходзіў праз нашу дуброву.
Праходзіць і лес яму люб,
І кожны пакорліва дуб
Сыходзіць, дае яму сцежку.
На твары ягоным усмешка.
Прышоў ён у вёску да нас,
Зайшоў ён у бедную хату.
Вячэры сялянскай быў час.
І кажуць да госця:
— І Вас
Мы просім за стол небагаты.
Певень б'е поўнач крылом,
А Ленін сядзіць за сталом,
Прышчурыў разумнае вока:
— Хутка над вашым сялом
Выплыве сонца з аблокаў...
Вышаў ад нас раніцой.
Луг мігацеўся расой.
Сцежка пабегла ў палеткі.
Там, дзе ступіў ён нагой, —
Жыта, пшаніца трубой,
Густа пахучыя кветкі.
Ночы не знік яшчэ змрок, —
Глянулі людзі ў той бок,
Луг, дзе ля самага гаю, —
Сонейка свеціць, мігае.
Гэтак талкуюць і так,
Нехта палез на вятрак:
— Сонейка, — кажа, — мігае,
Ціханька ўсходзіць ад гаю...
Ранак не высушыў рос.
Зоры ў блакіце нябёс,
А сонейка свеціць пяшчотай.
Многа пабліскваe кос, —
Вышлі касцы на работу, —
Сонцам сагрэцца ахвота.
Іскрыцца ў вачах той прамень,
І хмуры зганяе ён цень,
І змрок ён развейвае шэры.
Падходзяць: шалашык. Там пень.
Алоўкам на чыстай паперы
Там Ленін выводзіць радкі:
— Ен піша.
— Ен піша, браткі.
Сплывае з туманамі змрок,
Лямпы дрыжыць аганёк:
То ярка, то квола мігае,
Шалаш асвятляе,
А людзям здаецца здалёк,
Што сонейка ўсходзіць ад гаю.
Сядзіць ён. Падпёрся рукой.
А лямпа мігае. Спакой.
Ен хмурыць задумліва бровы.
— Той самы?
— Той самы.
Зімой
Праходзіў праз нашу дуброву.
Бародка маленькім клінком.
Усім ён да рыскі знаём.
Усмешка ўсё тая-ж на твары.
Ен вышаў і кажа:
— Таварыш,
Дай, я прайдуся з касой...
З расой
Сцеле раўнюткі пракос.
Сталлю навойстраных кос
Звоніць мурожлівы луг.
Нашы дуброўны наўкруг.
Просты ён з імі як друг...
. . . . . .
Ранкам паглядзіш ці ў змрок—
Той-жа ўсё, той аганёк
Свеціцца ў вочы, мігае.
Людзям здаецца здалёк,—
Сонейка ўсходзіць ад гаю.
І ходзіць такі яшчэ слух,
Што часта прыходзіць на луг
У той-жа зялёны шалаш
Вучань ягоны, а наш
Настаўнік вялікі і любы.
Пра нас яны дбаюць удвух,
Куюць нашым ворагам згубу.

На беларускай кіностудыі

У 1945—46 г. г. павінна быць скончана будаўніцтва і абсталяванне кінофабрыкі «Совецкая Беларусь». Прывезлі ўжо два вагоны апаратуры для асвятлення, якая была вывезена немцамі, у перыяд акупацыі, у Рыгу.

З Алма-Аты хутка прыбудзе два вагоны арматуры і прэпаратаў ручной праяўкі, якімі можна будзе абсталяваць лабараторыю кінохронікі і дубляжнага аддзялення, дзе будуць перакладацца на беларускую мову мастацкія фільмы.

З надыходам вясны пачынаецца будаўнічы сезон. Пры дапамозе партыйных і совецкіх арганізацый студыя будзе адноўлена, абсталявана і пушчана ў эксплаатацыю. Вытворчая магутнасць яе мяркуецца—4—5 поўнаметражных карцін у год.

Рэжысёры разам са сцэнарыстамі вядуць падрыхтоўчую працу, каб адзін фільм пусціць у вытворчасць у 1945 г.

Рэжысёр В. Корш-Саблін працуе над сцэнарыем Лукаўскога аб выдатным беларускім герої-партызане Заслонаве.

М. Садковіч распрацоўвае пастановачны план на матэрыяле ўласнага сцэнарыя аб старажытным беларускім вялікім вучоным, асветніку Скарыну.

Пастаноўшчыкі — рэжысёры К. Саннікаў і С. Сплашноў працуюць над сцэнарыем К. Губарэвіча «Остлянд» (умоўная назва) аб мінскім падполлі. У сцэнарыі будзе адлюстравана роля комуністычнай партыі ў арганізацыі і кіраўніцтве народнай барацьбой партызанаў супроць фашыстаў.

Аўтар п'есы «Кастусь Каліноўскі» Е. Міровіч, піша сцэнарый паводле свайго твору, аб славутым беларускім дэмакраце, які змагаўся за вызваленне Беларусі.

Ленін-заснавальнік і правадыр вялікай партыі большэвікоў

Слаўную, гераічную гісторыю мае Усесаюзная комуністычная партыя большэвікоў. Пад яе кіраўніцтвам совецкі народ пабудаваў першую ў свеце социялістычную дзяржаву рабочых і сялян, адстаяў у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі свабоду і незалежнасць нашай Радзімы.

У дні Айчыннай вайны совецкі народ з новай сілай паказаў, што, маючы на чале такога ідэйнага правадыра і баявога кіраўніка, як вялікая партыя Леніна—Сталіна, ён здольны выйсці пераможцам з самых цяжкіх выпрабаванняў.

З іменем вялікага Леніна, з усёй яго кіпучай рэволюцыйнай дзейнасцю непарыўна звязана гісторыя большэвіцкай партыі, яе ўзнікненне і развіццё.

Калі Уладзімер Ільіч цяжка хворы ляжаў у Горках, таварыш Сталін на XII з'ездзе РКП(б) у сакавіку 1923 года гаварыў: «Я шкадую, што тут няма тав. Леніна. Калі-б ён быў тут, ён-бы мог сказаць: «25 год пеставаў я партыю і выпеставаў яе, вялікую і моцную». (XII з'езд РКП(б), стэнаграфічная справаздача).

* * *

Ленін разгарнуў у стройнае вучэнне геніяльную думку Маркса і Энгельса аб тым, што рабочы клас можа скінуць уладу буржуазіі, устанавіць сваю дыктатуру і пабудаваць комуністычнае грамадства, маючы на чале ідэйнага правадыра і кіраўніка ў асобе комуністычнай партыі. Ленін падкрэсліваў, што ў пролетарыята няма іншай зброі ў барацьбе за ўладу, акрамя арганізацыі. Ён узброіў большэвікоў цэльным і стройным вучэннем аб партыі, паказаўшы, што партыя — гэта частка рабочага класа, яго перадавы атрад, узброены рэволюцыйнай тэорыяй. Партыя, вучыў Ленін, з'яўляецца арганізаваным атрадам пролетарыята. Яна будуецца на пачатках дэмакратычнага цэнтралізма, мае адзіную праграму, адзіны статут, адзіны кіруючы цэнтр, праводзіць адзіную дысцыпліну, мацуе адзінства волі і дзеяння ўсіх сваіх членаў. Партыя — вышэйшая форма арганізацыі, закліканая кіраваць усімі другімі арганізацыямі працоўных; партыя — авангард рабочага класа, шчыльна звязаны з масамі працоўных.

Усе свае сілы і энергію Ленін аддаў справе будаўніцтва і ўмацавання партыі. Глыбока разумеючы абставіны і ўлічваючы канкрэтныя ўмовы, пры якіх стваралася пролетарская партыя ў Расіі, Уладзімер Ільіч наладзіў выпуск агульнарускай палітычнай газеты «Искра», якая стала цэнтрам аб'яднання марксісцкіх рэволюцыйных сіл. Ён арганізаваў партыйныя кадры на месцах, сабраў іх па ўсёй Расіі ў адно і згуртаваў у цэнтралізаваную пролетарскую партыю з яснай праграмай, цвёрдай тактыкай і адзінай воляй.

Пытанню будаўніцтва партыі Ленін прысвяціў многія свае навуковыя працы. У кнізе «Што рабіць?» ён выклаў ідэялагічныя асновы партыі, у кнізе «Крок наперад, два крокі назад»— арганізацыйныя асновы партыі, у кнізе «Дзве тактыкі социял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэволюцыі» — палітычныя і тактычныя асновы партыі, у кнізе «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм» — тэарэтычныя асновы партыі. Асновы большэвіцкай партыі, якія выкладзены ў гэтых выдатных класічных творах марксізма-ленінізма, атрымалі сваё далейшае развіццё ў другіх працах Уладзімера Ільіча.

Веліч Леніна, як арганізатара і правадыра самай моцнай і згуртаванай пролетарскай партыі ў свеце, заключаецца ў тым, што ён, бачучы непрыгоднасць для пролетарыята партый II Інтэрнацыянала, якія перарадзіліся пасля смерці Энгельса ў партыі социяльных рэформ, здолеў выкрыць і разграміць меншавіцкі «план» стварэння партыі ў Расіі па тыпу заходне-еўрапейскіх партый і ўзначаліў барацьбу за арганізацыю марксісцкай партыі новага тыпу. Ленін пабудаваў і выпеставаў партыю, здольную вырашаць велізарныя задачы новага перыяда развіцця — перыяда прамога штурму капіталізма. Ён стварыў партыю, здольную падрыхтаваць сілы, выхаваць рабочых і іх саюзнікаў у духу рэволюцыйнай барацьбы за дыктатуру пролетарыята, аб'яднаць і накіраваць да адзінай мэты социялістычны рух рабочага класа, сялянскі рух за зямлю і вызваленчы рух прыгнечаных народаў супроць імперыялізма, за нацыянальнае разняволенне і роўнапраўе. Ленін пабудаваў партыю, непрымірымую ў адносінах да апартуністаў, рэволюцыйную ў адносінах да буржуазіі, партыю згуртаваную і маналітную, партыю социяльнай рэволюцыі і дыктатуры пролетарыята, дастаткова смелую для таго, каб павесці пролетарыяў на барацьбу за ўладу, дастаткова вопытную для таго, каб разабрацца ў складаных умовах рэволюцыйных абставін і дастаткова гнуткую для таго, каб абыйсці ўсе і ўсялякія падводныя каменні на шляху да мэты. Ленін выпеставаў вялікую партыю, якая з'явілася ўзорам для ўсіх, хто хацеў мець сапраўдную рэволюцыйную марксісцкую партыю.

Большэвіцкая партыя стала моцнай і дужай дзякуючы таму, што Ленін пабудаваў яе на адзінстве марксісцкіх праграмных, тактычных і арганізацыйных поглядаў, надаваў выключную ўвагу сістэматычнаму палепшанню яе якаснага складу і вёў па шляху непрымірымай барацьбы з апартуністычнымі, антырэволюцыйнымі элементамі. Гэта была мудрая палітыка, якая магла быць выпрацавана і праведзена ў жыццё геніяльным арганізатарам і правадыром партыі новага тыпу, якім быў Ленін. «...Толькі ў выніку такой арганізацыйнай палітыкі, — пісаў таварыш Сталін у 1920 г. у артыкуле «Ленін, як арганізатар і правадыр РКП», — магла стварыць у сабе наша партыя тое ўнутранае адзінства і здзіўляючую згуртаванасць, валодаючы якімі яна безбалесна вышла з ліпеньскага крызіса пры Керанскім, вынесла на сваіх плячах Кастрычніцкае паўстанне, без сутрасенняў перажыла крызіс брэсцкага перыяда, арганізавала перамогу над Антантай і, нарэшце, дасягнула той нябачанай гнуткасці, дзякуючы якой яна ў стане ў любы момант перабудаваць свае рады і сканцэнтраваць сотні тысяч сваіх членаў на любой вялікай рабоце, не ўносячы замяшання ў сваё асяроддзе». Валодаючы вялікай арганізуючай і мабілізуючай сілай, што выкавана Леніным і Сталіным, партыя большэвікоў стварыла магутную совецкую дзяржаву і моцную социялістычную эканоміку, забяспечыла дружбу і маральна-палітычнае адзінства народаў СССР. Совецкая дзяржава, створаная вялікай партыяй большэвікоў, узвысілася як нязломная цытадэль социялізма.

Ленін арганізаваў і выпеставаў партыю ў суровых абставінах падполля, у непрымірымай прынцыповай барацьбе са шматлікімі ворагамі марксізма — з народнікамі, «легальнымі марксістамі», «эканамістамі», эсэрамі, меншавікамі, трацкістамі, адзавістамі, нацыяналістамі, анархістамі, апартуністамі ўсіх масцей.

Больш 40 год існуе згуртаваная і загартаваная партыя Леніна — Сталіна, падобнай да якой не ведае свет. Яна вытрымала ўсе выпрабаванні, прайшла слаўны шлях свайго развіцця і з кастрычніка 1917 года паспяхова кіруе першай у свеце совецкай социялістычнай дзяржавай рабочых і сялян. На вопыце шматгадовай барацьбы і стваральнай працы пад кіраўніцтвам ВКП(б) дзесяткі мільёнаў людзей пераканаліся ў магутнай сіле і арганізатарскіх вартасцях партыі большэвікоў, у яе ўменні прадбачыць ход падзей і весці нас па правільнаму шляху.

«Але арганізацыйныя вартасці Расійскай комуністычнай партыі, — пісаў таварыш Сталін,—прадстаўляюць толькі адзін бок справы. Партыя не магла-б вырасці і ўзмацнець так хутка, калі-б палітычны змест яе работы, яе праграма і тактыка не адпавядалі рускай рэчаіснасці, калі-б яе лозунгі не запальвалі рабочыя масы і не штурхалі наперад рэволюцыйны рух» (Сталін, «Аб Леніне», — стар. 10).

Ленін вучыў, што партыя можа выканаць сваю ролю перадавога барацьбіта і правадыра рэволюцыйнага руху, кіруючыся тэорыяй Маркса — Энгельса. Ленін вучыў партыю ўменню прыстасоўваць рэволюцыйную тэорыю да канкрэтных умоў краіны, улічваючы свае асаблівасць моманту і абставін. Яшчэ ў 1896 г. у артыкуле «Наша праграма», Уладзімер Ільіч пісаў: «Мы думаем, што для рускіх социялістаў асабліва неабходна самастойная распрацоўка тэорыі Маркса, бо гэта тэорыя дае толькі агульныя кіруючыя палажэнні, якія ўжываюцца ў прыватнасці да Англіі інакш, чым да Францыі, да Францыі інакш, чым да Германіі, да Германіі інакш, чым да Расіі» (Творы т. II, выданне III, стар. 514).

Ленін у дасканаласці валодаў тэорыяй Маркса. Ён развіваў і рухаў яе наперад. Кіруючыся марксісцкім вучэннем, ён яшчэ ў перыяд першай рускай рэволюцыі ўзброіў большэвіцкую партыю рэволюцыйнай тактыкай, якая адпавядала новым умовам класавай барацьбы пролетарыята і расійскай рэчаіснасці. У чым заключаўся тактычны план Леніна? У процівагу меншавікам, якія праводзілі паралель паміж буржуазнай рэволюцыяй у Расіі і буржуазнымі рэволюцыямі ў краінах Заходняй Еўропы, Ленін паказаў асаблівасці рускай рэволюцыі і звярнуў увагу на іх гістарычнае значэнне. У буржуазных рэволюцыях на Захадзе кіруючая роля належала буржуазіі, сялянства складала яе рэзерв, а пролетарыят вымушан быў адыгрываць ролю пасобніка буржуазіі. Меншавікі лічылі, што такое-ж размеркаванне роляў класаў павінна мець месца і ў Расіі, што ў выніку перамогі рэволюцыі да ўлады павінна прыйсці буржуазія. Ленін выявіў пустату «гістарычных паралеляў» меншавікоў і ўсю небяспеку іх тактычнага «плана». Ён паказаў, што новыя ўмовы развіцця капіталізма, які ўступіў у стадыю імперыялізма, і канкрэтныя абставіны ў Расіі такія, што кіраўніком буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі становіцца пролетарыят — самы перадавы і рэволюцыйны клас грамадства, яго саюзнікам выступае сялянства, а буржуазія адціраецца ад удзелу ў рэволюцыі. Ленін высунуў пролетарскія метады барацьбы — масавыя стачкі і ўзброенае паўстанне, у выніку перамогі якога павінен быць скінут царызм і ўстаноўлена рэволюцыйна-дэмакратычная дыктатура пролетарыята і сялянства. Ад рэволюцыі буржуазна-дэмакратычнай, вучыў Ленін, мы пяройдзем да рэволюцыі социялістычнай, якая будзе зроблена пролетарыятам і беднейшым сялянствам. Развіваючы далей гэта геніяльнае вучэнне, Ленін распрацаваў новую тэорыю социялістычнай рэволюцыі, тэорыю аб перамозе социялізма ў адной — асобна ўзятай краіне.

Партыя, пісаў таварыш Сталін, якая мае ў руках такую спадчыну, як тактычны план Леніна, як ленінскую тэорыю социялістычнай рэволюцыі, магла плысці наперад смела, не баючыся падводных каменняў.

Узброеная марксісцка-ленінскай тэорыяй і тактыкай пролетарскай рэволюцыі, партыя забяспечыла гегемонію рабочага класа ва ўсіх трох рускіх рэволюцыях, перамогу лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі, у выніку якой быў скінут царызм, і перамогу Вялікай социялістычнай рэволюцыі ў кастрычніку 1917 года, у выніку якой была скінута ўлада буржуазіі і памешчыкаў і ўстаноўлена дыктатура пролетарыята.

Ленін развіў далей і ўзняў на вышэйшую ступень вучэнне Маркса—Энгельса. Ленінізм, па вызначэнню таварыша Сталіна, ёсць марксізм эпохі імперыялізма і пролетарскай рэволюцыі, тэорыя і тактыка пролетарскай рэволюцыі наогул, тэорыя і тактыка дыктатуры пролетарыята ў асаблівасці. Ленін не спыняўся перад тым, каб, на падставе сутнасці тэорыі марксізма, замяніць асобныя, што ўстарэлі, яе палажэнні і вывады новымі, якія адпавядаюць наяўным умовам развіцця. Так, напрыклад, у пытанні аб формах палітычнай арганізацыі грамадства ў пераходны перыяд ад капіталізма да социялізма кіруючым заставалася да другой рускай рэволюцыі палажэнне Энгельса, што дэмакратычная рэспубліка з'яўляецца спецыфічнай формай для дыктатуры пролетарыята. Ленін, вывучаючы вопыт двух рэволюцый у Расіі, адкрыў новую форму палітычнай дзяржаўнай арганізацыі рабочага класа — рэспубліку Советаў. Лозунг Леніна аб заваяванні дыктатуры пролетарыята і стварэнні рэспублікі Советаў хутка авалодаў масамі. Пад гэтым лозунгам рабочыя ў саюзе з сялянскай беднатой у кастрычніку 1917 года пайшлі за партыяй большэвікоў на штурм капіталізма.

«Што было-б з партыяй, з нашай рэволюцыяй, з марксізмам, — гаворыцца ў «Кароткім курсе гісторыі ВКП(б)»,— калі-б Ленін спасаваў перад літарай марксізма і не адважыўся замяніць адно з старых палажэнняў марксізма, сфармуляванае Энгельсам, новым палажэннем аб рэспубліцы Советаў, якое адпавядае новым гістарычным абставінам? Партыя блукала-б у поцемках, Советы былі-б дэзарганізаваны, мы не мелі-б совецкай улады, марксісцкая тэорыя пацярпела-б сур'ёзную страту. Прайграў-бы пролетарыят, выйгралі-б ворагі пролетарыята».

Дзякуючы таму, што Ленін адкрыў Советы, як дзяржаўную форму дыктатуры рабочага класа, а партыя арганізавала і ўзначаліла барацьбу рабочых мас і сялянскай беднаты за заваяванне рэспублікі Советаў, пролетарыят атрымаў найвялікшую перамогу, марксісцкая тэорыя ўзбагацілася яшчэ больш, аўтарытэт партыі большэвікоў узняўся яшчэ вышэй.

Пасля пераможнага заканчэння грамадзянскай вайны Ленін узброіў партыю большэвікоў планам гаспадарчага адраджэння краіны, мудрай і дальнабачнай палітыкай паваротu ад ваеннага комунізма да НЭП'а і ўказаў правільны шлях ператварэння Расіі нэпаўскай у Расію социялістычную. Маючы ленінскі план стварэння социялістычнай эканомікі, развіты і разгорнуты таварышом Сталіным у велічную праграму індустрыялізацыі СССР і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, кіруючыся марксісцка-ленінскай тэорыяй і тактыкай дыктатуры пролетарыята, распрацаваным вялікім Леніным, большэвіцкая партыя забяспечыла пабудаванне социялістычнага грамадства ў СССР.

Ленін з глыбокім веданнем справы вызначаў палітычны змест работы партыі і правяраў кожны яе крок на вопыце на практыцы. Накіроўваемая ганіем правадыра, партыя ва ўсёй сваёй дзейнасці заўсёды кіравалася марксізмам і падыходзіла да тэорыі навуковага комунізма не дагматычна, а творча, улічваючы асаблівасці існуючых гістарычных абставін і новыя ўмовы развіцця. Таму палітычныя лозунгі большэвіцкай партыі запальвалі рабочыя масы і вялі іх наперад.

ВКП(б) выросла ў вялікую партыю, якая беззаветна падтрымліваецца працоўнымі масамі, заваявала іх любоў і дабілася гістарычных поспехаў таму, што ў партыі слова ніколі не разыходзіцца са справай; палітычны змест яе дзейнасці, праграма і тактыка, арганізацыйныя формы яе работы адпавядаюць інтарэсам дыктатуры пролетарыята і пабудавання комуністычнага грамадства.

І толькі цвёрдае кіраўніцтва правадыра, які спалучае ў сабе тэарэтычную магутнасць з велізарным рэволюцыйным вопытам, з арганізацыйным талентам генія, магло забяспечыць правільную палітычную лінію партыі і практычнае правядзенне яе ў жыццё. Такім быў правадыр большэвіцкай партыі Ленін, такім з'яўляецца яе правадыр таварыш Сталін— паплечнік Леніна па будаўніцтву і кіраўніцтву партыяй і самага ўзнікнення большэвізма.

Ленін да апошніх дзён жыцця вёў партыю на шляху далейшага развіцця, павышаў яе арганізаванасць і боездольнасць, мацаваў адзінства волі і адзінства дзеянняў усіх комуністаў, усіх партыйных арганізацый. Ён завяшчаў большэвікам трымаць высока і захоўваць у чыстаце вялікае званне члена партыі, захоўваць адзінства партыі, як зрэнку вока.

Пасля смерці Леніна ворагі ленінізма і совецкага народа — трацкісты, зіноўеўцы, бухарынцы і іншыя, якія потым дакаціліся да змовы з фашызмам супроць нашай Радзімы, імкнуліся падарваць адзінства партыі, дэзарганізаваць яе, збочыць з ленінскага шляху. ВКП(б) пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна, які замяніў свайго любімага настаўніка — Ільіча, бязлітасна выкрыла і разграміла заклятых ворагаў, адстаяла і ўмацавала, як ніколі раней, ідэйнае і арганізацыйнае адзінства сваіх радоў.

У працах таварыша Сталіна, напісаных пасля смерці Леніна, вучэнне аб партыі новага тыпа, аб арганізацыйнай будове і метадах яе работы атрымала сваё далейшае развіццё. Віднае месца сярод гэтых прац займаюць: «Аб асновах ленінізма», «Да пытанняў ленінізма», «Яшчэ раз аб социял-дэмакратычным ухіле ў нашай партыі», а таксама «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», складзены пры бліжэйшым удзеле таварыша Сталіна. У іх таварыш Сталін, тэарэтычна абагульняючы вопыт барацьбы большэвізма за ўладу Советаў і яе ўмацаванне, развіў далей вучэнне аб партыі, як зброі дыктатуры пролетарыята і як кіруючай і накіроўваючай сіле совецкага народа. Велізарным укладам у скарбніцу марксізма-ленінізма з'яўляецца кніга таварыша Сталіна «Аб вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза».

Узброеная вучэннем Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна большэвіцкая партыя прайшла слаўны шлях свайго развіцця. У дакладзе аб 26-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі таварыш Сталін гаварыў:

«Кіруючай і накіроўваючай сілай совецкага народа як у годы мірнага будаўніцтва, так і ў дні вайны з'явілася партыя Леніна, партыя большэвікоў. Ні адна партыя не мела і не мае такога аўтарытэта сярод народных мас, як наша большэвіцкая партыя. І гэта зразумела. Пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў рабочыя, сяляне і інтэлігенцыя нашай краіны заваявалі сабе свабоду і пабудавалі социялістычнае грамадства. У дні Айчыннай вайны партыя з'явілася перад намі, як натхніцель і арганізатар усенароднай барацьбы супроць фашысцкіх захопнікаў. Арганізатарская работа партыі злучыла ў адно і накіравала да агульнай мэты ўсе намаганні совецкіх людзей, падпарадкавала ўсе нашы сілы і сродкі справе разгрому ворага. За час вайны партыя яшчэ больш параднілася з народам, яшчэ шчыльней звязалася з шырокімі масамі працоўных.

У гэтым крыніца сілы нашай дзяржавы».

Большэвіцкая партыя заслужана карыстаецца ў народзе найглыбейшай любоўю і велізарным давер'ем. Па закліку партыі рабочыя, калгаснікі, совецкая інтэлігенцыя, усе як адзін узнімаюцца на выкананне любых задач, што ўстаюць перад краінай, і паспяхова вырашаюць гэтыя задачы. За годы вялікай Айчыннай вайны ў рады партыі Леніна—Сталіна ўступіла больш 3-х мільёнаў чалавек. Такі рост радоў большэвіцкай партыі — лепшае сведчанне яе велізарнага аўтарытэта ў народзе, згуртаванасці ўсіх працоўных вакол ВКП(б), вакол свайго правадыра і настаўніка таварыша Сталіна.

Рабочыя, калгаснікі і інтэлігенцыя нашай Радзімы даверылі свой лёс кіраўніцтву партыі Леніна—Сталіна. Гэта таму, што большэвіцкая партыя змагаецца за справу народа і ажыццяўляе правільнае і празарлівае кіраўніцтва краінай, таму, што партыя прывяла совецкі народ да перамог, слава якіх не загасне ў вяках.

Блізкая канчатковая перамога совецкага народа над нямецкімі захопнікамі яшчэ раз паказвае нязломную магутнасць нашай дзяржавы, мудрасць сталінскага кіраўніцтва краінай і яе ўзброенымі сіламі. Партыя большэвікоў, якую натхняе геній Сталіна, вядзе Совецкі Саюз па слаўнаму пераможнаму шляху, паказанаму вялікім Леніным.

Д. БАХШЫЕЎ.

„СЯВІЛЬСКІ ЦЫРУЛЬНІК"

(Беларускі Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета)

Камічную оперу італьянскага кампазітара Д. Расіні «Сявільскі цырульнік» у выкананні беларускіх артыстаў мінчане бачаць і слухаюць не ўпершыню. Яна паказвалася задоўга да вайны. Цяпер гэты спектакль глядач убачыў у новай рэдакцыі.

Дасціпны і яркі камедыйны змест оперы, які насычаны жартамі і прыгожай буфоннай музыкай, даваў пастаноўшчыку (рэжысёр Ул. Шахрай) магчымасць больш дасканалага ўвасаблення на сцэне цудоўнага музычнага твора. Пастаноўшчык мала праявіў вынаходлівасці. Масавая сцэна музыкаў ля балкона Разіны (1-я карціна, 1-ы акт) пазбаўлена лірыкі кахання, невыразная, малаарганізаваная. Сцэна з салдатамі (2-я карціна, 1-ы акт) праходзіць непрыкметна з той прычыны, што недаволі даносіцца ўся тонкасць і чароўнасць юмара. Сцэна, у якой граф разыгрывае бакалаўра, навучаючы Разіну музыцы, пастаўлена штучна. Гэтая сцэна, таксама як і трук, дзе доктар дон-Барталё доўга сядзіць на канапе з працягнутай рукой, трымаючы чорны шматок, які ён выдраў з сутаны дон-Базільё, нічым не апраўданы, а з'яўляецца няўдалай выдумкай пастаноўшчыка. Наогул, рад трукаў (з прывязаным крэслам, з кветкай і інш.), якія прыдуманы рэжысёрам, у спектаклі мала апраўдваюцца тэкстам і музыкай. Гэта хутчэй штампы, якія існуюць шмат год і лічацца як-бы ўпрыгожаннем оперы, а ў сапраўднасці — з'яўляюцца непатрэбным дадаткам да спектакля. Невыразнасць оперная пастаноўкі толькі і тлумачыцца тым, што рэжысёру цяжка было адыйсці ад існуючых оперных канонаў, якія на вялікі жаль яшчэ маюць месца на сцэне.

Што-ж да вакальных вобразаў спектакля, дык яны ў пастаноўцы ўдалыя і сведчаць аб пэўных дасягненнях артыстаў. Аднак, на вялікі жаль, існуе разыходжанне паміж пастаноўшчыкам і выканаўцамі.

Упрыгожаннем спектакля з'яўляецца лірычная група вобразаў — Разіна, Альмавіва і Фігаро.

Найбольш цікавая фігура спектакля— Разіна, у выкананні арт. Л. Аляксеевай. Разіна ў пастаноўцы трактуецца, як вобраз узвышанай, закаханай, а мясцінамі, нават і лёгкадумнай дзяўчыны. Лірычныя пачуцці Разіны надаюць оперы лёгкасць і празрыстасць. З захапленнем слухаюцца прывабныя арыі ў выкананні арт. Аляксеевай.

Граф Альмавіва таксама лірычны персанаж. Арт. І. Балоцін добра выконвае гэтую ролю. У кожнай новай сцэне ён знаходзіць рознастайныя фарбы для адценьвання тонкага пачуцця кахання і маладосці. Прыемна слухаць мілагучныя італьянскія серэнады і арыі, якія выконвае артыст па-майстэрску. Аднак, было-б пажадана, каб выканаўца удасканаліў сваю дыкцыю і даносіў-бы слова да слухачоў, ад чаго ў значнай ступені залежыць і ўражанне.

Цэнтральнай фігурай спектакля з'яўляецца Фігаро (арт. А. Арсенка). Вобраз спрытнага і дасціпнага слугі выразны ў спектаклі.

Дзве сатырычныя фігуры, якія напісаны кампазітарам у гратэскным плане, і ў спектаклі сыграны камедыйна выразна (дон-Базіліё і доктар дон-Барталё).

Арт. І. Мурамцаў грае дон-Базіліё ў беларускім тэатры ўжо доўгі час. Ён творча адносіцца да сваёй ролі, таму і гэты раз яна сыграна артыстам удумліва, выразна і пранікнёна. Фарбы гратэска, якія выяўлены ў жэстах і ў манеры спявання (смешная таямнічасць) накіраваны да асмяяння каталіцкага манаха. Асабліва запамінаецца выкананне артыстам арыі аб паклёпе.

Доктар дон-Барталё — гэта хцівы стары. Над ім увесь час кпіць Фігаро і граф. Арт А. Бялоў, які выступае ў беларускім тэатры толькі ў другі раз, паказаў сябе таленавітым выканаўцам. Ён адчувае і добра перадае юмар, стрымана і тактоўна праводзіць у спектаклі сатырычныя сцэны. Яго гратэсковасць не выбіваецца з музычнага вобразу. Сцэнічна гэты вобраз амаль самы ўдалы ў спектаклі. Відавочна, што артыст мае багатыя камедыйныя здольнасці.

Дырыжор М. Шнэйдэрман адчувае лёгкасць і празрыстасць музыкі, яе гратэсковы і камедыйны каларыт, таму і дасягае выразнасці ў выкананні.

Мастацкае афармленне спектакля няўдалае (мастак Прусакоў). У дэкарацыях пераважаюць шэрыя таны, якія надаюць каларыту сонечнай Сявільі пахмурнасць і аднастайнасць. Павільёны таксама афармлены ў нейкія жоўта-рыжовыя фарбы, гарнітуры падабраны выпадковыя, а гэта значна зніжае поспех спектакля.

Да пастаноўкі спектакля «Сявільскі цырульнік» трэба было аднесціся больш сур'ёзна і ўдумліва.

А. ЕСАКОЎ.

«Сявільскі цырульнік» у Беларускім Дзяржаўным ордэна Леніна тэатры оперы і балета. На здымку: народны арт. БССР І. Балоцін у ролі графа Альмавіва, нар. арт. БССР Л. Аляксеева ў ролі Разіны, нар. арт. БССР А. Арсенка ў ролі Фігаро.

СЕСІЯ АКАДЭМІІ НАВУК БССР

20 красавіка, у Мінску, адкрылася першая, пасля вызвалення нашай рэспублікі ад нямецкіх захопнікаў, сесія Акадэміі навук Беларускай ССР. Сесія прысвечана важнейшым задачам аднаўлення народнай гаспадаркі БССР, разбуранай фашысцкімі барбарамі.

Прэзідэнт Акадэміі навук БССР тав. К. В. Гораў кароткім уступным словам адкрывае сесію:

— Немцы,—кажа т. Гораў, — нанеслі велізарную шкоду нашай Радзіме.

Але фашысцкім цемрашалам не ўдалося знішчыць беларускую совецкую культуру і беларускую совецкую інтэлігенцыю. З першых-жа дзён вызвалення БССР ад фашысцкіх акупантаў, пачалася велізарная аднаўленчая работа. Не малую ролю ў аднаўленні народнай гаспадаркі павінны адыграць вучоныя Совецкай Беларусі і ўся Акадэмія навук з усімі яе інстытутамі.

Сесія заслухае даклады, якія маюць вялікае практычнае значэнне для аднаўлення прамысловасці, сельскай гаспадаркі, для аднаўлення і планіравання разбураных гарадоў, для механізацыі сельскай гаспадаркі, развіцця жывёлагадоўлі і развязання другіх праблем першаступеннай важнасці.

22 красавіка пачынае сваю працу сесія Аддзялення грамадскіх навук Беларускай Акадэміі навук.

На сесіі будуць заслуханы даклады акад. Нікольскага, Перцава, Панкратавай, прафесараў М. Дабрыніна, А. Уса, А. Савіча, паэта П. Глебкі і др.

У рабоце сесіі Акадэміі навук прымае ўдзел сакратар ЦК КП(б)Б тав. Ц. С. Гарбуноў і намеснік старшыні СНК БССР тав. І. М. Ільюшын.

ПАДРЫХТОЎКА КАДРАЎ ДЛЯ ТЭАТРАЎ

Пры Першым Беларускім Дзяржаўным Драмтэатры імені Янкі Купалы арганізуецца акторская студыя. Прынята ўжо дваццаць чалавек. Студыйцы пройдуць двухгадовую праграму. Яны будуць вывучаць акторскае майстэрства, гісторыю тэатра і іншыя дысцыпліны, якія дапамогуць ім авалодаць асноўнымі ведамі тэатральнага мастацтва. Навучаннем будуць кіраваць вопытныя педагогі—артысты БДТ-1.

Дзяржаўная харэаграфічная школа пад мастацкім кіраўніцтвам народнай арт. БССР Васільевай рыхтуе кадры для балета. У школе навучаюцца дзеці франтавікоў, партызанаў і выхаванцы дзіцячых дамоў.

У ГРОДНІ

У Гродню на гастролі прыбыў Дзяржаўны Рускі драматычны тэатр БССР пад мастацкім кіраўніцтвам Народнага артыста рэспублікі Арлова. У рэпертуары тэатра «Сустрэча ў цемры», «12 ноч», «Крамлёўскія куранты». (БелТА).

СОВЕЦКІЯ КНІГІ, УКРАДЗЕНЫЯ НЕМЦАМІ

На захадзе ад горада Рацібора ў адным фабрычным будынку знойдзены дзесяткі тысяч совецкіх кніг, вывезеных немцамі з Мінска.

Вялікі цэх фабрыкі завалены кнігамі. На падлозе ляжаць творы Дзяржавіна, Ламаносава, Пушкіна, Талстога, Мечнікава, Ціміразева, Шэкспіра, творы рускіх, беларускіх, украінскіх пісьменнікаў і паэтаў, навуковыя даведнікі, падручнікі, тэхнічныя і медыцынскія кнігі.

На кнігах—пячаткі Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імені Леніна, Беларускай Акадэміі навук, Віцебскай бібліятэкі. Значную частку нарабаваных кніг немцы паспелі знішчыць.

КОНКУРС НА ПОМНІК ГЕРОЯМ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

У Гродні адбыўся конкурс праектаў на збудаванне помніка героям Айчыннай вайны, якія загінулі за вызваленне горада. На конкурс было прадстаўлена каля дваццаці праектаў. Прэміі прысуджаны тром праектам: першая—Байскаму, другая — Раманскаму, трэцяя— Байшэўскаму.

ХРОНІКА ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА

ПРЭМ'ЕРА ПАЛЕСКАГА ТЭАТРА

Палескі драматычны тэатр у Мазыры паказаў сваю новую працу— прэм'еру п'есы Астроўскага «Без віны вінаватыя». Гэты спектакль пастаўлен мастацкім кіраўніком М. Кавязіным. Ролю Кручынінай выконвае арт. Н. Вінтоўкіна, Нязнамава—арт. У. Пальцеўскі. Да першага мая будзе пастаўлена п'еса К. Сіманава «Так і будзе».

«НЕДЗЕ Ў МАСКВЕ»

Баранавіцкі абласны драмтэатр паказаў камедыю-рэв'ю «Недзе ў Маскве» Маса і Чарвінскага ў пастаноўцы мастацкага кіраўніка тэатра Я. Танальскага. Галоўныя ролі выконвалі артысты: Я. Танальскі (лейтэнант Мельнікаў), Е. Ерпічава (Нюра), Г. Ружанскі (Каваленка). Музыка да спектакля напісана кампазітарам А. Жыгоцкім. Мастацкае афармленне мастака А. Шымановіча. Глядач цёпла сустрэў пастаноўку.

ПРЭМ'ЕРА Ў РУСКІМ ДРАМАТЫЧНЫМ ТЭАТРЫ БССР

Гэтымі днямі Рускі драматычны тэатр БССР, які мае сваю сталую базу ў Магілеве, паказаў прэм'еру «Тры сястры» А. П. Чэхава.

У галоўных ролях выступілі артысты З. Арлоў, А. Абуховіч, В. Чэмберг і др.

ПАДРЫХТОЎКА ДА АБЛАСНОЙ МАСТАЦКАЙ ВЫСТАЎКІ

Мастакі горада Віцебска дзейна рыхтуюцца да абласной мастацкай выстаўкі. Яна адкрыецца 1 мая. Пачалі паступаць першыя экспанаты. На выстаўцы шырока будуць паказаны работы народных майстроў — ткачых, вышывальніц і ганчароў.

Лепшыя мастацкія творы будуць пасланы на Усесаюзную мастацкую выстаўку «Перамога».

(БЕЛТА).

ДЗЯРЖАЎНЫ СІМФАНІЧНЫ АРКЕСТР

Упраўленне па справах Мастацтва пры СНК БССР вырашыла арганізаваць Дзяржаўны сімфанічны аркестр пры Беларускай Дзяржаўнай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Філармоніі. У склад аркестра ўвойдуць музыканты сімфанічнага аркестра Беларускага тэатра Оперы і Балета. Дзяржаўным сімфанічным аркестрам будзе дырыжыраваць А. Броя. У першую праграму ўвойдуць сімфанічныя творы беларускіх, рускіх і замежных кампазітараў.

«ВЯРТАННЕ НА РАДЗІМУ»

Закончаны і хутка будзе выпушчаны на экран дакументальны фільм кінастудыі «Совецкая Беларусь»—«Вяртанне на радзіму». Карціна раскажа аб рэпатрыяцыі беларусаў з Польшчы на родную зямлю Совецкай Беларусі.

Рэжысёр карціны В. Будзіловіч, аператар І. Вейнеровіч.

«БЕЛАРУСЬ» № 6

Гэтымі днямі з друку выйшаў № 6 двухмесячнага грамадска-палітычнага і літаратурнага часопіса «Беларусь».

У багатым па зместу нумары змешчаны артыкулы П. Калініна, І. Кожара, прафесара Пражскага універсітэта Здэнэка Неедлага, Ільі Эрэнбурга, У. Пічэты, Ул. Шэмпеля, Л. Барага, І. Дорскага, Алесі Александровіч, М. Ларчанкі, нарысы Міхася Лынькова і Барыса Ямпольскага, паэмы і вершы Якуба Коласа, Пімена Панчанкі, Максіма Лужаніна, Піліпа Пестрака, Васіля Віткі, Алеся Астапенкі, Мікалая Гамолкі, Алеся Зарыцкага, Кастуся Кірэенкі і Міхася Калачынскага, апавяданні і навелы Ільі Гурскага, Усевалада Краўчанкі, Алеся Стаховіча і Алеся Якімовіча. У нумары ёсць таксама даведнік і хроніка.

АТ—29769. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Рэволюцыйная вул. № ..

Друкарня «Чырвоны друкар», Рэволюцыйная, 12.

Рэдкалегія: Л. АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ, А. БАГАТЫРОЎ, Г. ГЛЕБАЎ, Я. КОЛАС, А. КУЛЯШОЎ (адказны рэдактар), А. КУЧАР, П. ПЕСТРАК